**Савет Міністраў**
**Рэспублікі Беларусь**

**Упаўнаважаны па справах**
**рэлігій і нацыянальнасцей**

вул. Камуністычная, 11, 220029, г. Мінск
тэл./факс +375 17 284 63 44
e-mail: religion@belarus21.by

**Совет Министров**
**Республики Беларусь**

**Уполномоченный по делам**
**религий и национальностей**

ул. Коммунистическая, 11, 220029, г. Минск
тел./факс +375 17 284 63 44
e-mail: religion@belarus21.by

24.10.2022 № 05-31/52

на № ____________ от ____________

Аб разглядзе звароту

Паважаны

У апараце Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей разгледжаны Ваш электронны зварот па пытанні функцыянавання касцёла Святога Сымона і Святой Алены ў г.Мінску пасля надзвычайнага здарэння.

Інфармуем, што комплекс касцёла Святога Сымона і Святой Алены з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю другой катэгорыі рэспубліканскага значэння.

Указаны комплекс будынкаў знаходзіцца ў гаспадарчым веданні КУП "Мінская спадчына" і перададзены па дамове бязвыплатнага карыстання рэлігійнай абшчыне "Рымска-каталіцкая парафія касцёла Святога Сымона і Святой Алены". Уласнікам зямельнага ўчастка з'яўляецца КУП "Мінская спадчына".

У выніку ўзгарання ў будынку касцёла 26 верасня 2022 г. агнём была пашкоджана маёмасць на плошчы 20 м$^2$.

На пазачарговым пасяджэнні камісіі па надзвычайных сітуацыях пры адміністрацыі Маскоўскага раёна г.Мінска 30 верасня 2022 г. было прынята рашэнне аб забароне эксплуатацыі культавага аб'екта. Гэта мера звязана з неабходнасцю забеспячэння бяспекі людзей, якія прыходзяць у будынак касцёла, і захавання комплексу будынкаў, які з'яўляецца аб'ектам гісторыка-культурнай спадчыны і знаходзіцца пад абаронай дзяржавы.

У будынку касцёла адключана электра-, цепла-, водазабеспячэнне. Усе названыя сістэмы патрабуюць рамонтна-аднаўленчых работ у рамках устаноўленых норм і ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам. Да завяршэння абследавання комплекс будынкаў выведзены з эксплуатацыі.

14 кастрычніка 2022 г. у Мінскім гарвыканкаме адбылася нарада з удзелам зацікаўленых ва ўрэгуляванні сітуацыі, па выніках якой сумесна з прадстаўнікамі Рымска-каталіцкай царквы ў Рэспубліцы Беларусь

вызначаны мерапрыемствы па аднаўленні паўнавартаснага функцыянавання культавага аб'екта.

Аб выніках разгляда звароту просім праінфармаваць іншых заяўнікаў.

Намеснік Упаўнаважанага А.І.Радчанка